# ЭСТАФЕТУ ПРЫНЯЎ ПЯЦІДЗЕСЯТЫ

Другі тыдзень па краіне крочыць юбілейны год, якім азнамянуецца паўстагоддзе жыцця Савецкай дзяржавы.

Сорак дзевятую гадавіну Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі савецкія людзі сустрэлі выдатнымі поспехамі. Ніколі яшчэ наша краіна не вырабляла столькі прамысловай прадукцыі, не збірала столькі зерня, бавоўны і іншай сельскагаспадарчай прадукцыі, як у 1966 годзе. Плённым ён быў і для калектыву Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна. Звыш 150 спецыялістаў раз'ехалася ў розныя куткі нашай краіны, каб сваёй працай памнажаць славу Радзімы; больш 600 манаграфій, вучэбнікаў і брашур універсітэцкіх аўтараў атрымалі пуцёўку ў жыццё. Нямала навуковых даследаванняў нашых кафедраў і лабараторый укаранёны ў вытворчасць — прамысловасць, транспарт, сельскую гаспадарку.

Аб узрослым аўтарытэце універсітэта, як навуковага цэнтра, сведчыць той факт, што толькі прадстаўнікі біялагічнага факультэта за апошні час выступілі з чатырнаццацю дакладамі на міжнародных і ўсесаюзных форумах вучоных. Аб выніках сваіх даследаванняў на з'ездах і сімпозіумах часта дакладваюць універсітэцкія фізікі, матэматыкі, філолагі... І наогул, падводзячы вынікі за мінулы год, кожнаму факультэту ёсць чым пахваліцца.

Аб гэтых поспехах многа гаварылася на перадсвяточных вечарах, сустрэчах, якія адбыліся ва універсітэце. Аб іх выкладчыкі і студэнты рапартавалі на дэманстрацыі 7 лістапада. Калі наша святочная калона ўступіла на Цэнтральную плошчу Мінска, дыктар Беларускага радыё з гонарам паведаміў, што за 45 год свайго існавання універсітэт даў краіне каля 20 тысяч спецыялістаў высокай кваліфікацыі, што ў яго сценах выхаваны вядомыя вучоныя, дзяржаўныя і партыйныя работнікі, дзеячы літаратуры і мастацтва, камандзіры вытворчасці. Прывітаннем у гонар згуртаванасці вакол ленінскай партыі шматнацыянальнай сям'і прафесараў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў старэйшай навучальнай установы рэспублікі закончыўся гэты кароткі, але вельмі змястоўны радыёрэпартаж.

Напярэдадні свята калектывы факультэтаў прынялі на сябе новыя сацыялістычныя абавязацельствы ў гонар 50-годдзя Савецкай улады. Да юбілею ва універсітэце будуць падрыхтаваны дзесяткі доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, манаграфій і вучэбных дапаможнікаў. Нашы вучоныя парадуюць Радзіму новымі навуковымі адкрыццямі, дасягненнямі ў падрыхтоўцы маладых спецыялістаў.

Юбілейны год, пяцідзесяты год Савецкай улады, прыняў эстафету. Абавязак партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый зрабіць усё для таго, каб сацыялістычныя абавязацельствы былі не толькі выкананы, але і перавыкананы. Прадстаіць вялікая работа ва ўсіх галінах дзейнасці універсітэцкага калектыву. Выканаць яе можна толькі тады, калі кожны будзе працаваць у поўную меру сваіх магчымасцей, праяўляць ініцыятыву, дапамагаць адзін аднаму.

Шырэй спаборніцтва за дастойную сустрэчу 50-годдзя Савецкай улады!

## ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

11—12 лістапада ў актавай зале галоўнага корпуса універсітэта адбыўся агульны справаздачна-выбарчы партыйны сход. Са справаздачным дыкладам аб рабоце парткома выступіла сакратар партыйнага камітэта Т. Я. Дударава.

У рабоце сходу прынялі ўдзел сакратар Мінскага абкома КПБ А. Т. Караткевіч, першы сакратар Ленінскага райкома партыі М. А. Дубавец і міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі М. В. Дарашэвіч.

У спрэчках выступілі сакратар партбюро юрфака П. А. Дубавец, дэкан па навучанню замежных грамадзян К. К. Герман, дэкан біялагічнага факультэта П. Р. Пятровіч, дацэнт кафедры гісторыі КПСС А. А. Філімонаў, дэкан фізфака І. П. Зяцькоў, загадчык кафедрай палітэканоміі С. Я. Янчанка, загадчык кафедрай І. А. Мазжухін, дэкан матфака А. А. Гусак, партгрупорг другога курса юрфака Г. А. Вярцінскі, загадчык кафедрай матэматычнага аналізу Ф. Д. Гахаў, дэкан хімфака Ф. М. Капуцкі, дэкан філфака Р. В. Булацкі, сакратар Мінскага абкома КПБ А. Т. Караткевіч, рэктар універсітэта А. Н. Сеўчанка.

Па справаздачнаму дакладу і спрэчках прынята пастанова.

Абран новы састаў партыйнага камітэта, на першым арганізацыйным пасяджэнні якога сакратарсм выбрана дацэнт Т. Я. Дударава.

* * *

На адбыўшайся ў мінулы панядзелак камсамольскай канферэнцыі з справаздачным дакладам выступіў сакратар камітэта камсамола Г. Я. Рылюк. У састаў камітэта камсамола выбрана 46 членаў і 6 кандыдатаў. Сакратар — М. Ціва.

* * *

Напярэдадні свята Вялікага Кастрычніка была праведзена прафсаюзная канферэнцыя супрацоўнікаў нашага універсітэта. У абмеркаванні справаздачнага даклада, з якім выступіў старшыня мясцкома І. Т. Рагоўскі, прыняло ўдзел 12 чалавек. Старшынёй мясцкома зноў выбраны дацэнт І. Т. Рагоўскі.

Ніжэй друкуюцца матэрыялы з партыйнага сходу, камсамольскай і прафсаюзнай канферэнцый.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 34 (647) | Пятніца, 18 лістапада 1966 года. | Год выдання XX. | Цана 2 кап.

Партыйнае жыццё

## КАМУНІСТАМ БЫЦЬ—СПРАВЕ НАРОДА СЛУЖЫЦЬ

У абстаноўцы працоўнага і палітычнага ўздыму,—пачала справаздачны даклад сакратар парткома Т. Я. Дударава, — савецкі народ ідзе насустрач 50-й гадавіне Вялікага Кастрычніка і 100-годдзю з дня нараджэння Ул. І. Леніна. Разам з усім савецкім народам да гэтых знамянальных падзей рыхтуецца і партыйная арганізацыя, прафесарска-выкладчыцкі калектыў і студэнцтва універсітэта.

Характарыстыку дзейнасці партыйнай арганізацыі дакладчык пачынае з аналіза саставу партыйнай арганізацыі па нацыянальнай прыналежнасці, партыйнаму стажу і роду занят каў. З дадзенай характарыстыкі вынікае, што партыйная арганізацыя універсітэта з'яўляецца шматлікай і інтэрнацыянальнай. У яе складзе працуюць як людзі з вялікім жыццёвым вопытам і ведамі, так і маладыя камуністы. Усе яны маюць гарачае жаданне аддаць свае сілы, веды, вопыт справе паляпшэння падрыхтоўкі і выхавання высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі.

Партыйны камітэт у сваёй практычнай дзейнасці імкнуўся да таго, каб перш за ўсё аказваць дапамогу і падтрымку пярвічным партыйным арганізацыям у іх рабоце. Важнейшыя пытанні ўнутрыпартыйнага жыцця партком выносіў на абмеркаванне агульных сходаў камуністаў універсітэта. За справаздачны перыяд было праведзена пяць такіх сходаў. За гэты ж час адбылося 35 пасяджэнняў парткома, на якіх разгледжана 187 пытанняў. Каб пераканаца, якім шырокім быў абсяг дзейнасці парткома, назавём некаторыя з іх. Гэта «Аб рабоце з кандыдатамі партыі», «Аб рабоце партарганізацыі філфака», «Аб рабоце камітэта ДТСААФ», «Аб падрыхтоўцы навуковых кадраў праз аспірантуру», «Аб рабоце кафедры палітычнай эканоміі», «Аб рабоце куратараў геафака», «Аб рабоце камуністаў, выбраных у кіруючыя камсамольскія і прафсаюзныя органы» і г. д.

Пытанні, якія выносіліся на абмеркаванне парткома і сходаў, як правіла, дэталёва рыхтаваліся шырокім колам партыйнага, камсамольскага і прафсаюзнага актыву.

Неабходна адзначыць, што за справаздачны перыяд факультэцкія партыйныя арганізацыі значна ўзмацнелі, накапілі станоўчы вопыт у рабоце. Гэтаму ў многім садзейнічала тое, што ў склад бюро факультэцкіх арганізацый выбраны актыўныя, ініцыятыўныя таварышы. У мінулым саставе гэта тт. Матвіенка Е. А., Халімановіч М. П., Шлык В. Г., Паўленка Н. А. У цяперашнім — Мельцар Д. Б., Самсонаў А. В., Кастроў І. Ф., Фешчанка Ф. С., Кесарава Е. П., Стрэльчанка В. Н., Гусак С. А., Сіліванчык П. П.

Заслугоўвае ўвагі вопыт работы партарганізацыі гістарычнага факультэта. У яе саставе 137 камуністаў. Тут многа цікавых метадаў работы. Партыйны камітэт вывучыў работу партыйных груп гісторыкаў і рэкамендаваў партыйным арганізацыям іх станоўчы вопыт.

Вялікая ўвага надавалася галоўнаму пытанню нашай работы—паляпшэнню якасці падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. У цэнтры ўвагі знаходзілася нядаўняя пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі спецыялістаў і ўдасканаленню кіраўніцтва вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй». Пытанні вучэбнай работы не сходзілі з парадку дня пярвічных партыйных арганізацый, бюро факультэтаў.

У цэлым узровень партыйнай работы адпавядаў узросшым задачам і патрабаванням. росту і развіццю універсітэта. За справаздачны перыяд адкрыліся новыя кафедры і аддзяленні. Гэта аддзяленне геалогіі на геаграфічным факультэце, аддзяленне філасофіі на гістарычным факультэце, аддзяленне палітычнай эканоміі на юрыдычным факультэце. Значна папоўнілася вучэбная база навейшым абсталяваннем, што дае магчымасць палепшыць якасць падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, павялічыць размах навукова-даследчай работы ва універсітэце.

Партыйная арганізацыя універсітэта ўдзяляла вялікую ўвагу рабоце з выкладчыцкімі кадрамі, іх навуковаму і палітычнаму росту, бо якасць падрыхтоўкі спецыялістаў залежыць ад узроўню выкладання. Гэтыя намаганні прынеслі свой плён. За мінулы год пяць выкладчыкаў універсітэта (Л. В. Валадзько, В. М. Сікорскі, І. І. Гарэлік, М. І. Крукоўскі, В. А. Платонаў) абаранілі доктарскія дысертацыі і 27 выкладчыкаў кандыдацкія—С. А. Гусак, А. В. Шыбаева, Ул. А. Кулажанка, М. І. Іоська, В. З. Рабушка, В. А. Баркан і іншыя.

Патрэба ў кадрах вышэйшай кваліфікацыі ўвесь час узрастае. Яна вымагае паляпшэння работы аспірантуры. Нажаль, пераважная большасць аспірантаў не абараняе кандыдацкіх дысертацый у тэрміны. За апошнія пяць гадоў закончыла аспірантуру 240 чалавек, а абаранілі кандыдацкія дысертацыі толькі 83. Вельмі зацягваецца абарона дысертацый у аспірантаў філфака. Часткова гэта вынік таго, што кафедры не заўсёды сур'ёзна падыходзяць да прыёму аспірантаў. Новаму складу парткома належыць глыбей заняцца падрыхтоўкай кадраў вучоных.

Дакладчык падрабязна спынілася на пытаннях арганізацыі вучэбнага працэсу. На многіх кафедрах шырока практыкуюцца ўзаеманаведванні заняткаў, разгляд індывідуальных планаў вучэбнай, навуковай і метадычнай работы. Нядрэнна вырашалася пытанне вывучэння, абагульнення і распаўсюджання вопыту лепшых выкладчыкаў, аказання метадычнай дапамогі пачынаючым выкладчыкам у авалодванні педагагічным майстэрствам. Дзякуючы гэтаму ў летнюю сесію ў параўнанні з зімовай павялічылася колькасць выдатнікаў, менш стала двоечнікаў. Тут немалая заслуга і студэнцкіх партыйных груп, у радах якіх 350 чалавек. Многія студэнцкія партыйныя групы, у прыватнасці гістфака, прымаюць актыўны ўдзел у правядзенні вучэбнай і выхаваўчай работы. Але многія групы, партыйныя арганізацыі факультэтаў яшчэ далёка не поўнасцю выкарыстоўваюць свае магчымасці ў барацьбе за трывалыя веды. У летнюю сесію нездавальняючыя адзнакі атрымалі 19 камуністаў, а 160 здалі экзамены на пасрэдна.

(Працяг на 2-й стар.).

## ВІТАЕМ «ВІТУ»

Не, гэта не новая насценная газета універсітэта. Проста газета біялагічнага факультэта, вядомая чытачам як «За мічурынскую біялогію» ці проста «Мічурынка», змяніла сваю назву. Новая назва нарадзілася некалькі год назад, таму ўсе работнікі факультэта сустрэлі з задавальненнем яе ўзаконенасць.

Зразумела, гэта не толькі фармальнасць. У суботу, 12 лістапада, новыя члены рэдкалегіі «Vita» і тыя, хто аддаў газеце некалькі год працы, сабраліся на расшыранае пасяджэнне. Адбылася вельмі цікавая размова аб лёсе любімай газеты. Выступілі член партбюро факультэта А. І. Ляўко, сакратар партыйнага бюро Е. П. Кесарава, дэкан П. Р. Пятровіч, асістэнт А. В. Малашэвіч, аспірантка Н. В. Батурыцкая, былы член рэдкалегіі Р. І. Ганчарова, студэнтка першага курса Т. Чурсіна.

Многа цікавых і карысных парад даў прысутным адзін з першых рэдактараў газеты, цяпер галоўны рэдактар выдавецтва «Вышэйшая школа» Н. Д. Гесь.

Састаў рэдкалегіі папоўнен аспірантамі і выкладчыкамі біяфака, якія раней працавалі ў рэдкалегіі гэтай насценнай газеты.

Галоўным рэдактарам абраны асістэнт кафедры заалогіі хрыбетных жывёл Л. П. Шкляроў, яго намеснікамі — Іван Даўгалевіч, Надзя Батурыцкая, Аляксей Пракапенка і Таня Чурсіна.

Новых поспехаў вам, біяжурналісты!

*Прафсаюзнае жыццё*

# ПОСПЕХІ АБАВЯЗВАЮЦЬ ІСЦІ ДАЛЕЙ

Арганізавана, па-дзелавому прайшла 2-га лістапада справаздачна-выбарчая прафсаюзная канферэнцыя супрацоўнікаў нашага універсітэта. У сваёй справаздачы мясцком, які быў выбраны роўна год назад, меў поўнае права заявіць, што прафсаюзныя арганізацыі дабіліся нядрэнных поспехаў у рабоце. Багаты іх уклад ва ўдасканаленне вучэбнага працэсу, у расшырэнне і паглыбленне навуковых даследаванняў. Дакладчык — старшыня мясцкома — дацэнт І. Т. Рагоўскі і выступіўшыя ў спрэчках дэлегаты адзначалі ўзмацнеўшую ролю прафсаюзаў таксама і ў выхаваўчай рабоце, у паляпшэнні побыту прафесарска-выкладчыцкага саставу, у арганізацыі іх адпачынку.

У значнай ступені гэтыя поспехі дасягнуты дзякуючы ўзмацненню планавых пачаткаў у рабоце і кантролю за выкананнем прынятых пастаноў. Мясцком, многія прафсаюзныя бюро сістэматычна прыцягвалі да складання планаў шырокі актыў, раіліся з кіраўнікамі факультэтаў, узгаднялі сваю дзейнасць з работай рэктарата, парткома і партыйных арганізацый факультэтаў. Усё гэта давала магчымасць сканцэнтроўваць сваю ўвагу на самых актуальных пытаннях, ахапіць уплывам большасць членаў прафсаюза. Дастаткова сказаць, што толькі ў пастаяннай рабоце камісій мясцкома прымала ўдзел больш за 120 чалавек, сотні супрацоўнікаў выконвалі розныя іншыя даручэнні.

За справаздачны перыяд праведзена два агульнауніверсітэцкія сходы, 19 пасяджэнняў мясцкома. Рэгулярна праходзілі сходы на некаторых факультэтах. Мясцовы камітэт разглядаў забеспячэнне факультэтаў і кафедраў кадрамі, размеркаванне паміж імі вучэбнай нагрузкі, прымаў меры да таго, каб прафбюро штодзённа займаліся гэтым важным і цяжкім у даны момант для універсітэта пытаннем.

Трэба згадзіцца з дэлегатамі І. П. Зяцьковым, А. С. Федзенка, Л. В. Валадзько і іншымі, што сам мясцком у вырашэнні гэтай актуальнай задачы не заўсёды праяўляе настойлівасць, іншы раз работа ў гэтым напрамку зводзілася да кантролю, канстатацыі фактаў. Канешне, гэта таксама патрэбна, але неабходна канкрэтная дапамога дэканатам, кафедрам у падборы і расстаноўцы кваліфікаваных спецыялістаў. Такая дапамога заўсёды будзе прынята.

У нашым універсітэце працуе больш чым 1700 супрацоўнікаў, з іх 320 дактароў і кандыдатаў навук. Толькі за справаздачны перыяд абаронена звыш 30 доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. Прафесарамі і выкладчыкамі універсітэта па выніках навуковых даследаванняў 1965 года апублікавана больш 630 прац (10 манаграфій, 21 вучэбнік і вучэбна-метадычны дапаможнік, 600 брашур і артыкулаў). Агульная каштоўнасць гаспадарча-дагаворных навуковадаследчых прац, якія былі выкананы ў мінулым годзе супрацоўнікамі універсітэта, склала 550 тысяч рублёў.

Але, як не аднойчы пераконваліся члены мясцкома, заслухоўваючы справаздачы аб рабоце кафедраў, на некаторых факультэтах і аддзяленнях не хапае навуковых супрацоўнікаў. Гэта вядзе да перагрузкі людзей вучэбнай работай. І як вынік — зацягваецца выкананне важных даследчых тэм, слаба паляпшаецца вучэбны працэс. З-за недахопа выкладчыкаў у мінулым годзе прафесар Ф. Д. Гахаў, дацэнты Р. В. Булацкі, А. Н. Нахімоўская, П. А. Дубавец і іншыя выканалі нагрузку ў аб'ёме ў тысячу і больш гадзін. Цяжка ўявіць, як могуць прасачыць за якасцю лекцый і практычных заняткаў на матэматычным факультэце, дзе фонд пачасавікоў і сумяшчальнікаў складае большую частку вучэбнай нагрузкі.

Рост кантынгента студэнтаў, які ўзмацніўся асабліва за апошнія 3—5 год, апярэджвае рост навуковых супрацоўнікаў. Вырашыць гэтую праблему ў сілу аб'ектыўных прычын немагчыма за год-два. Але вырашаць яе трэба штодзённа. І вось тут прафсаюзныя арганізацыі і іх кіруючыя органы павінны знайсці сваё канкрэтнае месца. Канешне, справядлівым быў папрок на канферэнцыі ў адрас рэспубліканскага міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якое вельмі мала пакідае спецыялістаў з ліку аспірантаў для матэматычнага і некаторых іншых факультэтаў, але прычына не толькі ў гэтым. Трэба рацыянальней выкарыстоўваць асабістыя кадры, дапамагаць ім удасканальваць вучэбны працэс. Тут для дзейнасці прафсаюзаў шырокі абсяг.

Дэкан фізічнага факультэта І. П. Зяцькоў, напрыклад, адзначыў у сваім выступленні, што зараз змяніўся характар работы. Калі раней заняткі праводзіліся з невялікімі групамі студэнтаў, то цяпер лекцыйныя патокі перавышаюць 150—200 чалавек, а вучэбны працэс мала змяніўся. Вось бы і заняцца прафбюро і актыву факультэта выпрацоўкай новых форм работы, пытаннямі метадычнай арганізацыі вучэбнага працэсу. Карысць для ўсіх была б відавочнай. І. П. Зяцькоў агаварыўся, што ён меў на ўвазе прафбюро толькі свайго факультэта, якое, па сутнасці, стаяла ў баку ад вырашэння надзённых праблем вучэбнай і навукова-даследчай работы. Але ці трэба было агаварвацца: такі ж папрок можна было зрабіць і ў адрас іншых факультэтаў і мясцкому таксама. Не выпадкова таму прарэктар універсітэта Л. В. Валадзько зрабіў такое абагульненне, што мясцком абмяжаваў сваю ролю ў даным пытанні. Іншы раз адміністрацыйна-гаспадарчая частка, рэктарат і мясцком дзейнічаюць паасобку і тым самым не дасягаецца той вынік, які мог бы атрымацца пры сумеснай рабоце.

Але справа не толькі ў гэтым. Надышоў час, правільна гаварыў Л. В. Валадзько, павысіць адказнасць нізавых ячэек — прафгруп, ускласці на іх новыя і больш сур'ёзныя задачы. Тым самым мясцком разгрузіў бы сябе, атрымаў бы шмат часу для вырашэння пытанняў, маючых агульнауніверсітэцкае значэнне. А, дарэчы, яшчэ не ўсюды створаны прафгрупы. Дзіўна, што на такім факультэце, як фізічны, іх да гэтага часу няма.

На канферэнцыі шмат гаворкі вялося вакол павялічэння матэрыяльна-тэхнічнай базы, узмацнення увагі да тэхнікі бяспекі. Дэлегаты А. В. Кірсанаў, К. І. Грышын, А. А. Гедройц, О. В. Касцюк, Г. І. Марцынкевіч, І. Т. Ішчанка і іншыя, адзначыўшы вялікія заслугі мясцкома і ўсёй прафсаюзнай арганізацыі ў гэтай справе, паставілі шэраг новых задач, раілі, як лепш на справе вырашыць тое або іншае пытанне. Іх выступленні былі прасякнуты клопатамі аб стварэнні яшчэ лепшых умоў для работы і адпачынку прафесарска-выкладчыцкага калектыву і усіх супрацоўнікаў універсітэта. Зноў выбранаму мясцкому і факультэцкім прафсаюзным органам трэба ўлічыць усе заўвагі, прапановы, пажаданні.

Дэлегаты падтрымалі дакладчыка ў тым, што неабходна ўстанавіць стымул заахвочвання для выкладчыкаў, супрацоўнікаў, якія паспяхова выконваюць навукова-даследчую работу і т. д. Наогул, даклад І. Т. Рагоўскага быў глыбока прадуманым, у ім было многа каштоўных прапаноў, якія адобрыла канферэнцыя. Гаворка ідзе і аб навядзенні чысціні і парадку ў вучэбных карпусах, лабараторыях, аўдыторыях, дэканатах, і аб паляпшэнні работы абслугоўваючага персаналу, у прыватнасці, забеспячэнні прыбіральшчыц усім належным, і аб стварэнні неабходных умоў для летняга адпачынку, заняткаў супрацоўнікаў спортам і аб іншых важных пытаннях.

Карацей, галоўны вынік, які быў зроблены канферэнцыяй, можна сфармуляваць так: мясцком, прафсаюзная арганізацыя ў цэлым дабіліся добрых поспехаў у рабоце, якія абавязываюць іх ісці далей; неабходна глыбей унікаць у шматграннае жыццё універсітэта, паўсядзённа абапірацца ў сваёй дзейнасці на самы шырокі актыў, падтрымліваць ініцыятыву, развіваць самадзейнасць выкладчыкаў і студэнтаў у пастаноўцы і вырашэнні ўсіх праблем.

У сувязі з гэтым нельга не падтрымаць выступленне дэлегата канферэнцыі, каменданта інтэрната Г. М. Рабіновіча, які заклікаў выкладчыкаў дапамагчы студэнтам навесці, а пасля і захоўваць выдатны парадак у інтэрнатах. Студэнты-хімікі, падтрыманыя партбюро, камітэтам камсамола і прафсаюзнай арганізацыяй факультэта, у гэтай справе праявілі добры пачын — яны на нядзельніках зарабляюць грошы для рамонту інтэрната. Трэба, каб гэты пачын падтрымалі іншыя студэнты. Разам з тым неабходна ўзмацніць патрабаванне да тых, хто псуе дзяржаўную маёмасць, парушае правілы сацыялістычнага супольнага жыцця.

Дзелавым было выступленне прыбіральшчыцы Аляксандры Дзмітрыеўны Навумавай. Яна выказала шэраг прэтэнзій ў адрас адміністрацыйна-гаспадарчай часткі, прэтэнзій цалкам абгрунтаваных, і адзначыла, што на некаторых факультэтах яшчэ няправільна мяркуюць аб рабоце прыбіральшчыц. Канферэнцыя падтрымала яе заўвагі.

Падвёўшы вынікі зробленай работы, дэталёва абмеркаваўшы справаздачу мясцкома і справаздачу рэвізійнай камісіі, канферэнцыя выбрала новы састаў мясцкома і дэлегатаў на абласную прафсаюзную канферэнцыю работнікаў адукацыі, вышэйшай школы і навуковых устаноў. У састаў мясцкома выбрана 17 чалавек, у тым ліку два дактары навук. Старшынёй зноў выбран дацэнт І. Т. Рагоўскі.

**М. РЭГІСТАНАЎ.**

## САСТАЎ МЯСЦКОМА

**І. Т. РАГОЎСКІ — старшыня мясцкома, старшыня камісіі сацстрахавання;**
**А. С. КЛЯЎЧЭНЯ—намеснік старшыні мясцкома, старшыня арганізацыйнай камісіі;**
**В. В. СВІРЫДАЎ—старшыня вытворчай камісіі;**
**М. Я. ШКЛЯР—старшыня палітыка-выхаваўчай камісіі;**
**А. Н. БАСЯКОЎ—старшыня жыллёва-бытавой камісіі;**
**В. П. БАБРОВІЧ—старшыня камісіі па ахове працы і тэхніцы бяспекі;**
**Г. Я. РЫЛЮК—старшыня культурна-масавай камісіі;**
**В. С. ХРЭНАЎ—старшыня спартыўна-масавай камісіі;**
**К. П. НІЧЫПАРЭНКА—старшыня камісіі па пенсійных пытаннях;**
**Е. М. АНУФРЫЕЎ, В. А. ПЛАТОНАЎ, Л. І. ЛЕВІНА, О. В. КАЗЛОВА, А. В. ШЫБАЕВА, М. С. ГАРАШЧУК, В. Ф. ЦЕРАХОВІЧ, Р. А. ЖМОЙДЗІК—члены мясцкома.**



*Звыш чатырох тысяч студэнтаў прынята ў гэтым годзе на першыя курсы розных факультэтаў нашага універсітэта. Актыўна яны ўключыліся ў жыццё нашага вялікага калектыву. У гэтым ім дапамаглі выкладчыкі. На здымку: першакурснікі хімфака гутараць з дацэнтам В. В. Свірыдавым.*

Фота **Ю. Мароза.**

ДА ЎВАГІ нашых чытачоў і карэспандэнтаў: рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» цяпер размяшчаецца на першым паверсе галоўнага корпуса, пакой № 108.

# СЯБРА І ДАРАДЧЫК МОЛАДЗІ

**Працягваецца падпіска на «Чырвоную змену» — рэспубліканскую маладзёжную газету, якая вось ужо 45 год служыць верным сябрам і дарадчыкам беларускай моладзі.**

**Сярод мноства хвалюючых пытанняў, якія асвятляюцца на старонках газеты, значнае месца займаюць праблемы студэнцкага жыцця.**

**Як удасканаліць вучэбны працэс? Студэнцкае самакіраванне: за і супраць. Што такое ідэальны студэнт? Гэтыя пытанні газета мяркуе вырашыць разам са сваімі чытачамі ў бліжэйшы час.**

**Штомесячны студэнцкі спецвыпуск «Чырвонай змены» — «Брыганціна» прапануе свае старонкі для аматараў гарачых дыскусій, пачынаючых паэтаў, рамантыкаў навуковага пошуку. Заўзяты «паляўнічы за ведамі» можа паспрабаваць свае сілы ў спаборніцтве за званне «Эрудыт года», якое праводзіцца на старонках спецвыпуска.**

**Стань сябрам і чытачом сваёй газеты, студэнт! Кожнай групе — падпісны экземпляр «Чырвонкі»!**

**Падпіска прымаецца без абмежавання ўсімі аддзяленнямі сувязі і адказнымі ўпаўнаважанымі на факультэтах да 25 лістапада 1966 г.**

## Папраўка

У 26 нумары нашай газеты (16 верасня 1966 года) у артыкуле «Мы працуем для народа і працаваць павінны інтэнсіўна» была дапушчана памылка. Сярод выкладчыкаў, якія недавыканалі лекцыйную нагрузку, памылкова названы прозвішчы М. М. Драко, Ю. С. Патаенка, В. С. Карэліна, Н. С. Суднік і О. І. Калешка.

Рэдактар **М. І. ЮСЬКА.**

АТ 08045 Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 108, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. № 1507.